# Адкрытая лекцыя па камп'ютарнай лінгвістыцы

Падрабязнасці
Створана 22 Верасень 2015




**Шаноўныя выкладчыкі, студэнты і ўсе зацікаўленыя!**

**24 верасня (чацвер) у 14.15** адбудзецца адкрытая лекцыя па камп'ютарнай лінгвістыцы на філалагічным факультэце БДУ.

Адкрытую лекцыю правядуць супрацоўнікі Лабараторыі распазнавання і сінтэзу маўлення Аб'яднанага інстытута праблем інфарматыкі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.

Праблемнае поле, якое будзе закранутападчасвыступаў:

- Сімвальная і літарная апрацоўка тэксту.
- Паслоўная апрацоўка тэксту.
- Праверка арфаграфіі.
- Пераўтварэнне арфаграфічнага тэксту ў фанетычную і прасадычную транскрыпцыі.
- Сінтэзаванне маўлення па ўваходным тэксце.
- Запіс маўлення ў гукавыя файлы.
- Лінгвістычныя і акустычныя рэсурсы.
- Аўтаматызацыя складання спісу выкарыстаных крыніц для навуковых працаў.

Гэтыя і многія іншыя задачы могуць быць вырашаны сродкамі камп'ютарнай лінгвістыкі. Запрашаем прыняць удзел у адкрытай лекцыі, прысвечанай азнаямленню з бясплатнымі, вольнымі для выкарыстання ў Інтэрнэце сэрвісамі, якія вырашаюць падобныя задачы.

Усіх зацікаўленых чакаем 24 верасня ў 14:15 у актавай залена філалагічным факультэце БДУ па адрасе вул. К. Маркса 31.

Сайт лабараторыі: http://ssrlab.by/.
З пытаннямі можна звярнуцца да к.т.н. Юрася Гецэвіча +375 29 882 14 87 (MTS), +375 29 681 52 53 (Velcom).